# § 3. Выяўленчае мастацтва Сярэдніх вякоў: нябеснае і свецкае

Выяўленчае мастацтва ў эпоху Сярэдневякоўя было свайго роду «кнігай быцця», якая адкрывае вернікам шлях да пазнання ісціны. Мастацкія вобразы скульптуры, жывапісу і графікі, увасабляючы Боскі пачатак, у нагляднай форме настаўлялі гараджан на добрыя дзеянні.

**Знешняе ўбранне храмаў: скульптура.** Скульптура ў мастацтве Заходняй Еўропы выконвала ролю «ілюстраванай энцыклапедыі» хрысціянскага вучэння. Гэта і вызначыла яе месцазнаходжанне ў раманскіх храмах: асобныя рэльефы, стужкі фрызаў, а пазней і сюжэтныя шматфігурныя кампазіцыі парталаў апавядалі біблейскія гісторыі.

На адным з рэльефаў *Кафедральнага сабора ў італьянскім горадзе Мадэ́не* скульптар адлюстраваў у камені некалькі эпізодаў са Старога Запавету. Стужка рэльефу над заходнім парталам паслядоўна «распавядае» аб стварэнні людзей і іх грэхападзенні. «Аповеду» папярэднічае вобраз Усявышняга, які жэстам указвае на радкі Святога Пісання. Ён быццам звяртаецца да наведвальнікаў храма з наказам жыць праведна.



**Віліджэ́льма.** Рэльеф кафедральнага сабора ў Мадэне (фрагмент), Італія (канец XI — пачатак XII ст.)

У стварэнні вобразаў майстар звяртаецца да прыёму абагульнення: некалькі скажоныя прапорцыі і нехарактэрныя позы чалавечых фігур даюць толькі агульнае ўяўленне аб біблейскіх героях. Так, заклікаючы не да разумнага пазнання, а да эмацыянальнага ўспрымання, скульптар кладзе ў аснову мастацка-вобразнага тлумачэння сюжэтаў сімволіку жэстаў.

Найвышэйшае майстэрства ў выкананні вобразаў скульптуры прадэманстравалі французскія творцы гатычнай эпохі. Велічныя гарадскія саборы Францыі ўсе «прыбраныя» скульптурным дэкорам. Адмысловая разьба па камені і круглая скульптура ўпрыгожваюць парталы і сцены храмаў.

Як і ў раманскую эпоху, гатычная скульптура мела сімвалічны характар. Але персанажы ў ёй узаемадзейнічалі адзін з адным. У кампазіцыйным вырашэнні вылучаўся цэнтральны вобраз, да якога звярталіся астатнія фігуры. Так, ва ўбранні заходняга фасада *Ам'е́нскага сабора ў Францыі* галоўнае месца займае вобраз Ісуса Хрыста.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Фрагмент цэнтральнага партала заходняга фасада Ам’енскага сабора, Францыя (XIII ст.)

Седзячы на троне, ён уздымае рукі да нябёсаў, каб блаславіць праведныя душы. Яго постаць паказана франтальна і адрозніваецца ад іншых сваім маштабам. Стоячы на каленях, яго слухаюць Багародзіца, Іаан Хрысціцель і анёлы. Ніжэй размешчаны фігуры грэшнікаў і выбраных, якія пакорліва разыходзяцца ў супрацьлеглыя бакі. У падножжа — сцэна ўваскрашэння душ памерлых, у якой вылучаецца фігура архангела Міхаіла з вагамі ў руках.

Разгледзьце ў параграфе і на дадатковай старонцы скульптурныя вобразы, якія ўпрыгожваюць гатычныя храмы. Многія з іх прадстаўлены ў старажытнагрэчаскіх хітонах або старажытнарымскіх тогах. Як вы думаеце, чаму?

**Унутранае ўбранне храмаў: вітражы і фрэскі.** Інтэр’ер сярэдневяковых хрысціянскіх храмаў Заходняй Еўропы заўсёды меў багатае ўбранне. У мігценні полымя свечак на фоне паўзмроку вобразы скульптуры і жывапісу набывалі містычнае гучанне. Чароўнае святло спараджалі *вітражы́* — кампазіцыі з каляровага або бясколернага шкла, якія прымяняліся для асвятлення храма. Выявы вітражоў мелі шырокую тэматыку. Побач з персанажамі Старога Запавету, вобразамі святых, дзеячаў культуры нярэдка выкарыстоўваліся абстрактныя матывы. Ускладнялася і вітражная тэхніка. Каляровае шкло пакрывалася роспісамі, якія не толькі ўзмацнялі малюнак, але і надавалі яму аб’ём.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Адам. Вітраж Кентэрберы́йскага сабора, Англія (канец XII ст.)

Тэматыка *фрэсак*, якія ўпрыгожвалі сцены і скляпенні храмаў і манастыроў, не была вельмі шматграннай: яны апавядалі сюжэты Святога Пісання. Вобразы фрэскавага жывапісу, як і скульптуры, мелі сімвалічны характар. Мастакі імкнуліся ў простай і даступнай форме раскрыць сюжэт. Асабліва вылучаліся жэсты і атрыбуты персанажаў. Мовай жэстаў вобразы фрэсак прапаведавалі ісціны, а атрыбуты дапамагалі ясна зразумець, хто «вядзе маналог».

У раманскую эпоху ў Францыі сфарміраваліся дзве буйныя *школы фрэскавага жывапісу — школа светлых фонаў і школа сініх фонаў*. Прадстаўнікі першай з іх абралі светлую танальную гаму. У кампазіцыях пераважаў светла-жоўты фон, выявы былі плоскаснымі. Так, напрыклад, на *фрэсцы «Бітва архангела Міхаіла з цмокам» царквы Сен-Савэн-сюр-Гарта́н* у французскім горадзе Пуату́ персанажы паказаны на першым плане, быццам выстраеныя ў рад. Малюнак прапрацаваны выразна і лаканічна: тут няма лішніх дэталей. Вялікае значэнне адводзіцца эмоцыям, якія павінны ахапіць вернікаў пры суціранні кампазіцыі.

У зусім іншай манеры, характэрнай для школы сініх фонаў, выканана *фрэска «Хрыстос Пантакра́тар»* — Усеўладны — у *царкве Сан-Кleме́нтэ дэ-Таўль у Іспаніі*. Кампазіцыю адрозніваюць яркія кантрасныя колеры з пера-



Бітва архангела Міхаіла з цмокам. Фрэска царквы Сен-Савэн-сюр-Гартан у Пуату, Францыя (1110 г.)



Хрыстос Пантакратар. Фрэска апсіды царквы Сан-Клементэ дэ-Тауль, Іспанія (XII ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вагай блакітна-сіняга. Арнаментальныя матывы ў вопратцы святых і абрамленні прасторы, у якой яны знаходзяцца, надаюць фрэсцы асаблівую ўрачыстасць. Вобразы кампазіцыі нібы застылі: яны раз'яднаныя і нерухомыя. І фігуры, і твары фрэскі аднатыпныя. І толькі сродкамі маштабу, колеру і дэкору майстар вылучае галоўнага персанажа.

Блакітна-сіні фон, які выкарыстоўвалі майстры фрэсак і вітражоў, атаясамліваўся з прыстанкам Божым — нябёсамі. У некаторых жывапісных кампазіцыях фон быў жоўтым, залатым. Як вы думаеце, што ён сімвалізаваў?

**Кніжная мініяцюра.** У параўнанні з вітражамі і фрэскамі кніжная мініяцюра дазваляла большую свабоду ў выбары як сюжэтаў, так і мастацкіх сродкаў. Ілюстраваліся і тэксты Святога Пісання, і літаратурныя творы — гістарычныя хронікі, паэтычныя зборнікі... Строгіх правіл у стварэнні персанажаў і характарыстыцы месца дзеяння тут не было. Ілюстрацыі толькі дапаўнялі тэкст.

Выраб рукапіснай кнігі патрабаваў часу і высокага майстэрства. Кожны рукапіс стваралі некалькі чалавек, якія працавалі ў спецыяльных памяшканнях — *скрыпто́рыях*. Адзін майстар рабіў пераплёт, другі займаўся напісаннем тэксту, трэці выпісваў *ініцыя́лы* — першыя літары раздзелаў, а чацвёрты ствараў мініяцюры... Пераплёты рукапісаў абцягвалі скурай і ўпрыгожвалі разьбой па слановай косці, а часам нават золатам і каштоўнымі камянямі. Кніга была сапраўдным скарбам!

Сам тэкст меў складанае напісанне. Асобныя словы і літары вылучаліся колерам або дапаўняліся арнаментальным малюнкам. Незвычайнае мастацкае афармленне атрымлівала першая літара главы або кнігі. Часам яна была падобная на казачную істоту, а часам утрымлівала ў аснове раслінны матыў. Ілюстрацыі змяшчаліся альбо сярод тэксту, альбо на асобнай старонцы, але заўсёды абрамляліся рамкай. Поле вакол тэксту часта было ўпрыгожана ажурным перапляценнем раслінных завіткоў, выявамі прадстаўнікоў флоры і фаўны.

Ілюстрацыі выконваліся ў рознай манеры. У мініяцюрах на біблейскія сюжэты вобразы

**Цікавы факт**

Пры афармленні раннесярэдневяковых кніг шырока выкарыстоўвалася чырвоная фарба, якая па-латыні называлася «мініум». Ад яе і ўзнікла назва «мініяцюра».



Старонка рукапісу «Кніга гадзін», Францыя (XV ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Цікавы факт**

У гатычную эпоху даўжыня наска абутку адпавядала сацыяльнаму статусу яго ўладальніка. Найбольш доўгія насы меў абутак знатных асоб. Даўжыня іх абутку дасягала некалькіх дзясяткаў сантыметраў (да 70 см).



Сустрэча караля Шатландыі Роберта Бруса і Эдуарда III. Мініяцюра з «Хронік Жана Фруасара» (XIV ст.)

мелі абагульнены характар, фон паказваўся ўмоўна, а то і зусім заставаўся пустым. Мініяцюры гістарычных хронік адрозніваліся больш насычанай сюжэтнай лініяй. Персанажы паказваліся ў розных ракурсах, яны нібы размаўлялі адзін з адным. Кампазіцыі напаўняліся рухам, у іх адчуваўся дух эпохі.

Мастакі імкнуліся перадаць асаблівасці касцюма, паказаць побыт і моду свайго часу. Так, напрыклад, у ілюстрацыях *«Хронік Жана Фруаса́ра»* можна бачыць тыповы для гатычнай эпохі абутак з доўгімі насамі, высокія панчохі, кароткія курткі або кафтаны знатных асоб ці доўгую вопратку духавенства, капелюшы і турбаны... Вобразы мініяцюр гістарычных хронік Сярэдневякоўя служаць «энцыклапедыяй» культуры эпохі.

? У чым, на ваш погляд, заключаецца своеасаблівасць кніжных мініяцюр Сярэдневякоўя на гістарычныя і рэлігійныя сюжэты?

Выяўленчае мастацтва Сярэдневякоўя стала вобразным адлюстраваннем «душы хрысціянскай культуры». Мастацкія вобразы, натхнёныя верай, ствараліся на ўзроўні пачуццяў і эмоцый. Постаці, сімволіка жэстаў, поз і атрыбутаў персанажаў выражалі ідэі панавання нябеснага над свецкім.

## Пытанні і заданні

1. У скульптурным убранні сярэдневяковых цэркваў, сабораў асобнае месца займалі вобразы фантастычных істот — гаргу́лляў. Прачытайце пра гэтых істот на дадатковай старонцы. Падумайце, якое значэнне мелі гэтыя вобразы для раскрыцця сюжэтаў Святога Пісання. Аргументуйце свой адказ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне